Нявестка Фёдара Ядчука, Таццяна Андрэеўна, медыцынскі работнік. Яна ціск памерае, укол зробіць, а таксама прыбярэ і нагатуе. Аслеп ён у 93 гады. Завезла тады дзядулю ў бальніцу, а там сталі сумненні выказваць, ці трэба аперацыю рабіць у такім узросце. Нявестка настояла. Пасля аперацыі на адно вока зрок поўнасцю вярнуўся. І сталы чалавек чытае. Чытае ён, дарэчы, на польскай, рускай, беларускай мовах, хоць у школу ніколі не хадзіў. Сам навучыўся. Як і многае ў жыцці.

Чытае дзядуля Фёдар цяпер найбольш Біблію, святыя кніжкі. Але разважаць любіць на ўсялякія тэмы. «Жыць, — кажа, — трэба па сумленні, нікога не крыўдзіць, дрэннага не рабіць. А гарэлку піць з розумам. Я заўсёды мог чарку выпіць, але п'яным за ўсё жыццё мяне ніхто не бачыў».

Пагаварыць можна было б і больш, ды Фёдар Іосіфавіч сябе няважна адчуваў. Тыдзень таму ўнук вазіў яго на пахаванне сястры жонкі. І пасля гэтага літаральна злёг. Калі не ў форме, то фатаграфавацца, зразумела, не захацеў, прапанаваў свой здымак з дня нараджэння, калі яго прыходзілі віншаваць работнікі сацыяльнай службы.

А літаральна ўчора нявестка сказала па тэлефоне, што свёкру палепшала, ён значна акрыяў і ўзяўся чытаць свае любімыя кніжкі.

«Звычайна бацька на здароўе не скардзіцца, кардыяграма ў яго такая, што дактары здзіўляюцца, — расказаў сын доўгажыхара Віктар, — толькі вось недачувае». А калі ў паліклініцы прапанавалі набыць слыхавы апарат коштам каля 500 тысяч рублёў, Фёдар Іосіфавіч адмовіўся, палічыў, што дорага. Пасля кожнай пенсіі, паводле слоў сына, абавязкова дае па сотні тысяч то аднаму ўнуку, то другому. «Такія яны, старыя бацькі, што жывуць для дзяцей і ўнукаў да апошняга свайго дня», — заўважыў сын. У дзядулі, дарэчы, пяць унукаў, дзевяць праўнукаў.

— А на сваім 105-гадовым юбілеі, — расказала Жанна Касяк, спецыяліст цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, — ён гаварыў, што ўдзячны Богу за ўсё, што было ў жыцці. Цяпер жа гатовы ў любую хвіліну адысці, каб сустрэцца з дарагімі яму людзьмі, і найперш, са сваёй Любай.

Яшчэ расказваў, якім у маладосці быў кавалерам, як любіў спяваць, танчыць. І нават рызыкнуў станцаваць з дарагой госцяй пад апладысменты прысутных...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Драгічынскі раён.*

**Год прадпрымальнасці**

# ЦІ ПАДШТУРХНЕ СУСТРЭЧА ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА?

**Старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Віктар ДЗІЧКОЎСКІ правёў сустрэчу з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнэсу.**

Размова на сустрэчы ішла пра рэалізацыю Дырэктывы Прэзідэнта Беларусі № 4, правядзенне ў 2011 г. Года прадпрымальнасці, а таксама перспектывы развіцця малога бізнэсу. Паводле даклада В. Дзічкоўскага, зараз у Баранавічах 5700 індывідуальных прадпрымальнікаў 1185 прыватных прадпрыемстваў, а ўсяго ў малым і сярэднім бізнэсе працуе 16 тысяч чалавек. Удзельная вага падатковых паступленняў у бюджэт горада складае больш за 23%, а доля экспарту дасягае 30,5%. З'явіліся і буйныя прадпрыемствы. Напрыклад, УП «Мэблевая фабрыка «Лагуна», на якой працуе 1300 чалавек, трапіла ў разрад горадаўтваральных.

Кіраўнік горада прыцягнуў увагу прысутных да недахопу ў Баранавічах міні-кавярняў і магчымасці іх адкрыцця з дапамогай прадпрымальнікаў.

На вялікі жаль, прадстаўнікі бізнэсу вялі на сустрэчы сябе не вельмі актыўна і задалі кіраўніку гарвыканкама толькі два пытанні. Адзін удзельнік пацікавіўся, на якую рэальную дапамогу можа разлічваць малы бізнэс, што працуе на экспарт? І яму адказалі, што ў пытаннях экспарту могуць быць аказаны бясплатныя кансультацыі мытнікамі. Пасольства Беларусі ў краіне, куды прадпрымальнік пастаўляе сваю прадукцыю, таксама можа аказаць пасільную дапамогу. А што датычыцца рэкламы, то гэта справа таго, хто працуе на экспарт. Прасоўванне прадукцыі на экспарт магчыма і праз конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынках Расіі».

Другое пытанне, увогуле, не адносілася да праблемы прыватнага бізнэсу. Чалавека турбаваў стан вуліц у горадзе, а таксама тэрміны ўзвядзення ў мікрараёне Бараўкі школы і дзіцячага садка... Гэтая праблема для Баранавіч, бадай, самая набалелая.

*— Мы працуем над гэтымі пытаннямі, але яны капіталаёмістыя. Каб прывесці ўсе вуліцы горада ў парадак, патрэбна 400 млрд рублёў, а гэта больш за гадавы бюджэт горада. А дзіцячы садок у Бараўках запланавана ўзвесці ў наступным годзе, — адказаў В. Дзічкоўскі.*

Прадстаўнік Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Юркевіч, расказаў пра падтрымку, якую аказвае дзяржава прадпрымальнікам, і падкрэсліў, што сёння такую падтрымку ў першую чаргу атрымліваюць тыя, хто працуе на экспарт.

Дырэктар Цэнтра стандартызацыі і метралогіі Мікалай Лабко выступіў з прапановай:

*— На працягу 3 гадоў з таго часу, як прадпрымальнік пачаў сваю дзейнасць, яго нельга правяраць. Чалавек працуе, і яму здаецца, што ўсё ў яго правільна, але не заўсёды так бывае. А чаму б праз паўгода працы не звярнуцца да нас? Мы бясплатна праверылі б прадпрыемства, і калі там ёсць нейкія адхіленні, то ўказалі б на іх. Думаю, што гэта было б на карысць усім.*

Такія сустрэчы выклікаюць цікавасць, але, як сказаў адзін з прадпрымальнікаў, 80% іх праблем павінны вырашацца тымі, хто займаецца бізнэсам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# НАРАЧАНСКІ КРАЙ АБНАЎЛЯЕЦЦА

**Учора ў Мядзельскім райвыканкаме адбылася нарада па пытаннях рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця Нарачанскага рэгіёна на 2011—2015 гг. з удзелам губернатара Мінскай вобласці Барыса Батуры.**

Старшыня Мядзельскага райвыканкама Аляксандр Даніленка нагадаў, што на рэалізацыю Дзяржпраграмы выдаткавана 480 млрд рублёў, 100 з іх плануецца асвоіць сёлета.

— Указ Прэзідэнта № 514, — зазначыў старшыня, — адкрывае шырокія прэферэнцыі для інвестараў, якія прыйдуць на Мядзельшчыну: яны вызваляюцца ад падаткаў на нерухомасць, прыбытак і зямлю. Стала вядома, што беларускія кампаніі «Атлант-М» і «ТытуньІнвест», шэраг расійскіх інвестараў ужо выказалі намер укладваць сродкі ў развіццё будучага еўрапейскага курорта.

Па словах Аляксандра Іванавіча, працягваецца рэканструкцыя нарачанскіх здраўніц. Дабудоўваецца гасцініца «Нарач» у курортным пасёлку. У яе рэканструкцыю ўкладзена больш за 8 млрд рублёў. Плануецца, што гасцініца адчыніць дзверы сёлета ў маі. У санаторыі «Прыазёрны» працягваецца рэканструкцыя лячэбнага корпуса. Хутка там з'явяцца SPA-цэнтр, рэстаран, кавярня. У «Спадарожніку» пабудавалі 5 з 11 камфартабельных катэджаў. І там, па Праграме, хутка з'явіцца жылы корпус на 136 месцаў са SPA-цэнтрам, рэстаранам і кінаканцэртнай залай.

Па словах А. Даніленкі, чакаецца, што пасля завяршэння рэалізацыі Праграмы прыток адпачывальнікаў павялічыцца ў 2-2,5 раза. Сёння гэта 100-120 тыс. чалавек у сезон. Генеральны дырэктар ДПУ «Нацыянальны парк «Нарачанскі» Васіль Каржоў расказаў, што Акадэмія навук размеркавала рэкрэацыйную нагрузку на тэрыторыю, якая ўключана ў Дзяржпраграму. Унікальныя багацці Мядзельшчыны не пацерпяць.

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

Филиал **«Санаторий «Сосновый бор» ОАО «Белагроздравница»** сообщает об отмене проведения аукциона по продаже в частную собственность танцевальной площадки с эстрадой, расположенной по адресу: Минская область, Молодечненский р-н, д. Удранка, назначенного на 11 апреля 2011 года в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис»



*г. Мінск*

АФІЦЭРСКІ КРОК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Доктар адкажа**

# ЦІ ЦАЛКАМ СІНТЭТЫЧНЫЯ ВІТАМІННА-МІНЕРАЛЬНЫЯ КОМПЛЕКСЫ ЗАСВОЙВАЮЦЦА АРГАНІЗМАМ?

**ГАРАНТАВАЦЬ, што сінтэтычныя вітамінна-мінеральныя комплексы засвойваюцца арганізмам, а не праходзяць па ім транзітам, не зможа ніводны ўрач, перакананая загадчыца жаночай кансультацыі 11-ай гарадской паліклінікі г. Мінска Людміла Сцепаненка.**

— Гэта нельга праверыць ніякімі даследаваннямі. Рэальна можна сказаць пра засваенне жалеза і кальцыю, што пацвярджаецца спецыяльнымі аналізамі, — патлумачыла доктар.

Паводле яе слоў, лепш за ўсё, калі вітаміны і мінералы паступаюць у арганізм з ежай. У гэтым выпадку яны метабалізуюцца ў печані і цалкам засвойваюцца арганізмам. (Метабалізм — складаны працэс, у час якога арганізм расшчапляе пажыўныя рэчывы, што ўтрымліваюцца ў прадуктах, каб пасля выпрацаваць энергію, неабходную для падтрымання жыццёвага тонусу).

Між тым, нагадала Людміла Сцепаненка, у жыцці жанчын ёсць перыяды, калі арганізм мае патрэбу ў асаблівай падтрымцы. Так, падчас крытычных дзён абавязкова трэба прымаць прэпараты жалеза, інакш хуткая стомленасць і слабы імунітэт стануць вашымі пастаяннымі спадарожнікамі.

Тым, хто плануе цяжарнасць, неабходная фоліевая кіслата (яна прадухіляе з'яўленне парокаў развіцця нервовай сістэмы ў будучага дзіцяці). А тым, хто ўступіў у перыяд менапаўзы, трэба заняцца прафілактыкай астэапарозу. У прыватнасцІ, выбіраць прадукты харчавання з высокім утрыманнем кальцыю невялікай тлустасці (1—4%). Усім жанчынам, каб не страціць прывабнасць, патрэбны вітаміны А, В. Е, поліненасычаныя тлустыя кіслоты амега-3 (больш за ўсё іх у скумбрыі, печані, шпінаце, квяцістай капусце, фасолі).

**Вольга ГРЫГОР'ЕВА,** *«Мінск—Навіны».*

**Кватэрнае пытанне**

# НЕ ЗНІМУЦЬ... АЛЕ І НЕ ПАСТАВЯЦЬ

**Сёлета ў сувязі з жаніцьбай сына ў мяне пагоршыліся жыллёвыя ўмовы. Ці могуць паставіць мяне ў чаргу на атрыманне жылля ў той арганізацыі, дзе я працаваў да пенсіі?**

**С. К,** *г. Брэст.*

У адпаведнасці з падпунктам 34.1 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) за грамадзянамі, прынятымі на ўлік у перыяд працы, захоўваецца права знаходзіцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы, у прыватнасці, у выпадках звальнення ў сувязі з выхадам на пенсію незалежна ад далейшага працаўладкавання, у тым ліку ў іншы дзяржаўны орган, іншую арганізацыю. А вось спецыяльных нормаў, якія даюць права грамадзянам пасля выхаду на пенсію быць прынятымі на ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў у арганізацыі, дзе яны працавалі да дасягнення пенсійнага ўзросту, дзейнае жыллёвае заканадаўства не ўтрымлівае.

**Віктар САВІЦКІ.**

# Раста і безграшоўе

**Зваротная сувязь**

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся **жыхар Магілёва, інвалід Вялікай Айчыннай вайны Альберт АБРАМОВІЧ** з просьбай надрукаваць яго зварот да міністра сельскай гаспадаркі.

Праблема, з якой магілёўскі ветэран звяртаецца да ўладаў, — не яго асабістая, а грамадская. Справа ў тым, што Альберт Абрамовіч занепакоены лёсам ракі Раста і яе поймай. Для таго, каб усім было зразумела: Раста — невялікая рэчка ў Чавускім раёне Магілёўскай вобласці, прыток больш вядомай Проні.

Ветэран, якому цяпер 85 гадоў, з'яўляецца старэйшым ураджэнцам вёскі Гарбавіцкая Слабада. Ён вырас на беразе Расты і памятае, якой рака была мнагаводнай, багатай на рыбу і ракаў і як шмат добрага сена давалі паплавы!

«У межах кіламетра ад Расты людзі, якія жылі на хутарах і вёсках, не мелі калодзежаў, — піша міністру Абрамовіч. — Усе іх патрэбы задавальняла рэчка. Сама яна насычалася дробнымі рачулкамі і крыніцамі. Да вайны былі на ёй млыны і сажалкі пры іх. Але потым усё гэта было знішчана».

— Да вайны я лавіў ракаў у Расце і вазіў іх у Магілёў на гандаль, а паплавы людзі называлі сапраўднымі перлінамі, — узгадвае ветэран. — А цяпер... Якія там ракі і сена? Трэба з гэтым нешта рабіць, таму што ў Беларусі, на жаль, няма бязмежных земляў, каб імі раскідвацца. Трэба выкарыстоўваць прыродныя рэсурсы з розумам!

«Пойма ракі — да 20 квадратных кіламетраў, — працягваецца зварот. — Ці можна прыцягнуць гэтыя землі ў гаспадарчы абарот? Зрабіць каскады сажалак з наступным зарыбленнем? А берагі скарыстаць для размяшчэння дамоў адпачынку, турыстычных аб'ектаў і гэтак далей? Дайце рэчцы Раста другое дыханне!» Вось з такой прапановай звяртаецца ветэран з Магілёўскай вобласці ў Міністэрства сельскай гаспадаркі.

Улады Магілёўскай вобласці і Чавускага раёна ведаюць пра трывогі Альберта Абрамовіча. Ветэран пабываў на прыёме ў старшыні Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка: усё пачалося з пытання пра пераараную цяжкай сельскагаспадарчай тэхнікай дарогу да могілак паблізу вёскі Слабада, а закончылася гутаркай пра добраўпарадкаванне ракі Раста.

— Трэба расчысціць пойму ад пустазелля, паставіць плаціны, зрабіць сажалкі, зарыбіць іх і стварыць урэшце зону адпачынку для жыхароў абласнога цэнтра, — ветэран упэўнены, што гэта выдатны план развіцця тэрыторыі.

— Так, ніхто і не супраць, — пагаджаецца старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Чыканаў. — Але грошай на такія вялікія праекты нестае.

— Грошы заўсёды можна адшукаць і рабіць усё паэтапна, — настойвае Абрамовіч. — Цяпер жа ёсць інвестары. Трэба толькі варушыцца і думаць. У гэтых мясцін ёсць патэнцыял!

На прытоку самой Расты, рэчцы Рудзея, створана вялікае вадасховішча, на берагах якога размешчаны прафілакторыі і санаторыі. Менавіта тут планавалася зона адпачынку для жыхароў горада Магілёва, але само вадасховішча, паводле слоў спецыялістаў, зрабілі няправільна. На дне застаўся торф, які пры цёплым надвор'і змяняе якасць вады, яе колер і пах. Адным словам, там можна катацца на лодцы і водным матацыкле, але плаваць, асвяжацца ў спякоту ўсё ж не рэкамендуецца.

Што датычыцца ракі Раста, то яе наваколле даўно аблюбавалі дачнікі з Магілёва. Там жа ёсць і калгасныя палі. Аляксандр Чыканаў лічыць, што на Расце можна паспяхова развіваць аграэкатурызм.

— Гэта можа стаць выйсцем, бо, паўтаруся, цяпер вялікія інвестыцыйныя праекты рэалізаваць складана, — гаворыць старшыня раённага Савета дэпутатаў. — А што датычыцца самага надзённага — дарогі да вясковых могілак, то абавязкова зробім да Радаўніцы, каб людзям было зручна пад'ехаць.

Альберт Абрамовіч прыклаў да свайго звароту лісты з розных ведамстваў, якія прыйшлі ў адказ на яго прапановы. Аддзел энергетыкі і паліва Магілёўскага аблвыканкама паведаміў, што будаўніцтва на Расце міні-ГЭС эканамічна немэтазгоднае з-за вялікіх тэрмінаў акупнасці такога праекта.

Камітэт эканомікі аблвыканкама наконт зоны адпачынку расказаў, што ў любы момант гатовы разглядзець пытанне аб заключэнні дамовы з патэнцыйным інвестарам аб стварэнні аздараўленча-турыстычнага комплексу ў басейне ракі Раста. Аднак дзе адшукаць гэтага інвестара?

— Адным словам, адказ ва ўсіх адзін — прабачце, але безграшоўе, — каментуе ветэран.

Сам Альберт Абрамовіч ужо даўно жыве ў Магілёве, але ў родную вёску часта прыязджае як на дачу. Больш за тое, ён стаў ініцыятарам усталявання ў Гарбавіцкай Слабадзе дзвюх памятных дошак.

— Мая місія — пакінуць на роднай зямлі памяць пра тых людзей, якія тут жылі, — гаворыць пенсіянер.

На дошках — імёны і выявы тых, хто загінуў у Першую і Другую сусветныя войны на франтах, хто стаў мірнай ахвярай апошняй вайны і вярнуўся з яе інвалідам. Грошы на ўсталяванне памятных дошак ветэран збіраў з нашчадкаў жыхароў Гарбавіцкай Слабады (нават у Прыбалтыцы), дапамаглі і проста добрыя людзі. Два помнікі ўсталяваныя ў бярозавым гаі паблізу дарогі: першы — у 2005 годзе, а другі — летась, з урачыстай цырымоніяй і ўдзелам праваслаўнага святара.

Развіццё турыстычных маршрутаў, калі на Расце з'явіцца зона адпачынку для магілёўцаў, на думку Альберта Абрамовіча, дазволіць людзям даведацца пра мінулае гэтых мясцін. Цяпер жа, паведаміў Чавускі райвыканкам, вёска Слабада Гарбавіцкага сельсавета ўключана толькі ў пешаходны альбо веласіпедны маршрут «Па месцах баявой славы».

Безумоўна, пагаджаецца ветэран, у мясцовых уладаў шмат праблем — так бы мовіць, бягучых. Забеспячэнне жыццядзейнасці людзей, павышэнне дабрабыту, стабільная праца прамысловасці, вытворчасці малака, мяса ды бульбы... Спіс можна працягнуць. Таму ветэран лічыць, што для вырашэння праблемы трэба падключыць рэспубліку, і з гэтай нагоды ён і папрасіў надрукаваць у газеце «Звязда», падпісчыкам якой ён з'яўляецца, зварот да міністра сельскай гаспадаркі, і будзе чакаць слушнага адказу.

— Расту трэба зрабіць па-людску і давесці да розуму, каб кожны кавалак зямлі пусціць у справу, на карысць людзям і краіне, — перакананы інвалід вайны з Магілёва Альберт Абрамовіч.

**Ілона ІВАНОВА.**

# З ВІЛАМІ НА БАБРА

**У паляўнічых угоддзях Івацэвіцкага лясгаса непрацуючы грамадзянін у забаронены для палявання час і забароненым спосабам — гаспадарчымі віламі — незаконна здабыў бабра.**

Гэты факт устанавілі работнікі Бярозаўскай міжрайінспекцыі, а мясцовыя праваахоўнікі зараз вырашаюць пытанне адносна распачынання крымінальнай справы. Шкода ацэненая ў 2,5 мільёна рублёў (70 базавых велічынь).

А работнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі Валожынскай лесапаляўнічай гаспадаркі на меліярацыйным канале каля вёскі Букатава затрымалі электрыка БМУ «Саюзтэлефонбуд», які сумесна з непрацуючым грамадзянінам пры дапамозе дзвюх электралавільных установак незаконна здабыў 42 шчупакоў і 4 ментузоў. Шкода ацэнена ў больш чым 28 мільёнаў рублёў (810 базавых велічынь), вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці.

Непрацуючага грамадзяніна ў паляўнічых угоддзях Сенненскай раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў дзяржінспектары разам з егерам названага карыстальніка заспелі за разборам — разам з напарнікам — тушы самкі дзіка. А ў той было 8 эмбрыёнаў, таму шкода склала амаль 19 мільёнаў рублёў (540 базавых велічынь). Матэрыялы па гэтым факце накіраваныя ў Сенненскую пракуратуру.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Адсутнасць сталічнай рэгістрацыі — не перашкода для размеркавання ў Мінск

**РАЗМЕРКАВАННЕ, без перабольшання, не толькі самы трывожны і малапрыемны, але і самы адказны момант у жыцці кожнага выпускніка ВНУ: ад таго, дзе бліжэйшыя гады яму давядзецца набіраць прафесійнага досведу, залежыць вельмі многае. Аб тым, ці можна задаволіць дзяржаўны інтарэс да ўласнай персоны і не парушыць пры гэтым свае жыццёвыя планы, ішла размова на семінары ў БНТУ. На сустрэчу са студэнтамі былі запрошаны старшыня прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА і галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.**

*(Заканчэнне. Пачатак у «Чырвонай змене» за 6 красавіка.)*

— Будзем лічыць, што непасрэдна працэс размеркавання — для вас ужо этап пройдзены. Што трэба мець на ўвазе маладому спецыялісту? — расказвае Ларыса Манюк. — Як правіла, усіх цікавіць, калі выпускнік набывае статус маладога спецыяліста: у момант размеркавання і афармлення накіравання на працу ці ў момант заключэння дагавора з наймальнікам? У адпаведнасці з Палажэннем аб размеркаванні маладымі спецыялістамі з'яўляюцца выпускнікі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю першай і другой ступені на дзённай форме атрымання адукацыі за кошт бюджэтных сродкаў, накіраваныя на працу па размеркаванні. Гэта значыць, маладымі спецыялістамі яны становяцца з дня атрымання накіравання. У той жа час тэрмін працы па размеркаванні адлічваецца з дня заключэння працоўнага дагавора або кантракта з наймальнікам. Па жаданні маладога спецыяліста ў тэрмін яго адпрацоўкі па размеркаванні можа быць уключаны тэрмін службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь ці водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Прычым у водпуск па доглядзе дзіцяці можа пайсці як маці, такі бацька дзіцяці. Не пашкодзіць таксама ведаць, што работа да атрымання накіравання ў адпаведную арганізацыю не з'яўляецца работай па размеркаванні і, адпаведна, у тэрмін работы па размеркаванні не ўключаецца.

Апошнім часам жаданне быць накіраванымі на першае працоўнае месца ўсё часцей выказваюць і студэнты-«платнікі». У выпускніка, які навучаўся за ўласныя сродкі, ёсць магчымасць адмовіцца ад накіравання, але толькі да таго моманту, пакуль ён не падпіша з наймальнікам кантракт. Выпускнік можа паехаць на месца размеркавання, агледзецца, ацаніць узровень заработнай платы, умовы працы, наяўнасць сацыяльных гарантый, арганізацыю, нарміраванне працы і для сябе прыняць рашэнне наконт свайго далейшага працаўладкавання. Калі ён наогул адмаўляецца ад гэтага месца працы, то вяртаецца ў сваю навучальную ўстанову і здае выдадзенае накіраванне. Узамен атрымлівае даведку аб свабодным працаўладкаванні. У адрозненне ад выпускніка-«бюджэтніка», да якога не могуць прымяняць ніякіх карных санкцый. Магчыма, тым, хто канчаткова не вызначыўся з далейшымі жыццёвымі планамі, ёсць сэнс пайсці на кампраміс — напрыклад, заключыць кантракт тэрмінам не на два гады, а на год. Адным словам, трэба ўзважыць усе «за» і «супраць», бо кантракт ёсць кантракт.

Пасля заканчэння навучання ўсім маладым спецыялістам прадастаўляецца адпачынак працягласцю адзін каляндарны месяц, а выпускнікам педагагічных спецыяльнасцяў — 45 дзён. Гэта не водпуск, а менавіта адпачынак. Наймальнік у месячны тэрмін пасля заключэння працоўнага дагавора павінен выплаціць маладым спецыялістам грашовую дапамогу ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай у апошнім семестры. Толькі выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў атрымліваюць грашовую кампенсацыю па месцы навучання. Паколькі многія выпускнікі імкнуцца як мага хутчэй прыступіць да работы, матэрыяльная дапамога выплачваецца ім незалежна ад таго, выкарыстаў малады спецыяліст сваё права на адпачынак ці не. Майце гэта на ўвазе...

> **Наймальнік не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць работніка займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце па прычыне недастатковай кваліфікацыі»**

— Прыйсці да наймальніка вы павінны да таго дня, які ўказаны ў вашым накіраванні, — падкрэсліла Ларыса Манюк. — І калі там напісана, што вы павінны прыбыць да 1 жніўня, а вы раптам вырашыце адкласці свой візіт на 5 жніўня, то за гэты час наймальнік ужо паспее адправіць паведамленне ў вашу ВНУ, што будзе запісана, што малады спецыяліст па месцы размеркавання не з'явіўся. І калі вы не зможаце даказаць камісіі па размеркаванні, што ў вас былі на тое ўважлівыя прычыны, то з вас могуць спагнаць грошы за ўсе гады вашага бюджэтнага навучання.

**Цяпер што рабіць, калі малады спецыяліст прыбывае на месца размеркавання, а наймальнік адмаўляе яму ў працаўладкаванні ці прапануе яму іншую пасаду?**

— Дапусцім, вы інжынер, а вам прапануюць ніжэйшую пасаду і пры гэтым кажуць, што калі вы не пагаджаецеся, то яны вас не возьмуць на працу і вы будзеце вяртаць дзяржаве грошы за ўсе гады свайго навучання. Ці кажуць, што ваша пасада пакуль занятая, таму на паўгода-год вам прапануецца іншая праца. Думайце, ці патрэбна вам працаваць не па сваёй спецыяльнасці, паколькі калі вы пажадаеце змяніць месца працы праз два гады, то высветліцца, што ў вас няма стажу работы па атрыманай у ВНУ спецыяльнасці, — папярэджвае Ларыса Манюк. — Два гады работы па размеркаванні трэба правесці з максімальнай карысцю для сябе. А наймальнік проста абавязаны прадаставіць маладому спецыялісту працу па той спецыяльнасці, якая запісана ў яго накіраванні. І ні ў якім разе не пагаджайцеся афармляцца на месца работніка, які знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, таму што гэты работнік можа выйсці на працу ў любы момант, і тэрміновы працоўны дагавор з вамі з будзе скасаваны ці вам прапануюць іншую пасаду. Калі наймальнік адмаўляе ў працаўладкаванні (а такое здараецца, напрыклад, з-за змены штатнага раскладу), неабходна атрымаць у наймальніка пісьмовае тлумачэнне, дзе будзе пазначана, па якой прычыне працаўладкаванне маладога спецыяліста немагчыма. З гэтай паперай вы вяртаецеся ў ВНУ з просьбай аб пераразмеркаванні. Калі па адпаведнай спецыяльнасці ў навучальнай установе засталіся незадаволеныя заяўкі, маладога спецыяліста накіруюць на новае месца працы, а калі такіх няма — выдадуць даведку аб праве самастойнага працаўладкавання. Магчыма і пераразмеркаванне па персанальным запыце.

— Уважліва чытайце свой кантракт, — раіць Ларыса Манюк. — У кантракце павінны быць прапісаны меры матэрыяльнага стымулявання, вашы абавязкі і абавязкі наймальніка. На стадыі працаўладкавання вас павінны пазнаёміць таксама з правіламі ўнутранага распарадку і калектыўным дагаворам. Іх таксама раю ўважліва чытаць, паколькі ў калектыўным дагаворы могуць быць прапісаны матэрыяльныя выгоды, на якія вы таксама зможаце прэтэндаваць, а ў правілах унутранага распарадку можа быць занатаваная, напрыклад, забарона на курэнне, якая дзейнічае на тэрыторыі прадпрыемства або арганізацыі, ці нейкая іншая важная для вас інфармацыя. Працоўная кніжка, калі яе няма ў выпускніка, павінна быць аформлена на працягу пяці дзён пасля афармлення на працу.

> **Наймальнік абавязаны прадаставіць маладому спецыялісту працу па той спецыяльнасці, якая запісана ў яго накіраванні...**

Між іншым, у выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў ёсць адна важная прывілея. Справа ў тым, што паміж Міністэрствам адукацыі і ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі падпісана галіновае пагадненне, у якім прапісана, што кантракт з маладым спецыялістам можа быць заключаны толькі са згоды самога маладога спецыяліста. Гэтая норма абавязковая для ўсіх наймальнікаў сістэмы адукацыі. Малады спецыяліст сам вырашае, на якіх умовах яму працаваць: на ўмовах кантракта ці бестэрміновага дагавора. У кантракта ёсць пэўныя «плюсы» — напрыклад, у ім могуць быць занатаваныя нейкія дадатковыя матэрыяльныя выгоды ці дадатковыя дні для адпачынку. А асноўны «плюс» дагавора на нявызначаны тэрмін заключаецца ў тым, што наймальнік не зможа яго скасаваць па ўласнай волі, калі, безумоўна, не дакажа, што яго работнік — прагульшчык, парушальнік працоўнай дысцыпліны ці п'яніца.

Цяпер колькі слоў аб тым, якія прывілеі дае статус маладога спецыяліста. Самая галоўная прывілея — абарона ад звальнення на працягу двух гадоў. Маладым спецыялістам не ўстанаўліваецца выпрабавальны тэрмін. Наймальнік не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць работніка займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце па прычыне недастатковай кваліфікацыі». Звольніць маладога спецыяліста можна толькі за сістэматычнае парушэнне працоўнай дысцыпліны, але ў гэтым выпадку вам прыйдзецца вяртаць дзяржаве сродкі за навучанне.

Выпускнікі, якія працуюць не па месцы жыхарства бацькоў у бюджэтных арганізацыях, маюць права на атрыманне льготнага крэдыту для набыцця рэчаў першай неабходнасці. Медыкам і педагогам на працягу першых двух гадоў работы належаць дадатковыя выплаты.

А вось прадастаўленне жылля па месцы размеркавання, на жаль, заканадаўства маладым спецыялістам не гарантуе. Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць агаворана ў накіраванні на працу і працоўным дагаворы (кантракце). Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі выдаткаў на найм жылля. Але гэта іх права, а не абавязак.

Летась некаторыя з выпускнікоў, размеркаваныя ў сталіцу, сутыкнуліся з нечаканай праблемай: тыя з іх, хто аформіў пастаянную рэгістрацыю ў сталіцы да афармлення накіравання на работу і, адпаведна, набыцця статусу маладога спецыяліста, не змаглі стаць у чаргу на жыллё. На іх распаўсюдзіўся пяцігадовы «каранцін» — наяўнасць пяцігадовай рэгістрацыі ў Мінску. Цяпер у заканадаўстве з'явілася важнае ўдакладненне: маладыя спецыялісты, размеркаваныя ў Мінск, маюць права стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў незалежна ад даты іх прыбыцця ў сталіцу... Падставай для пастаноўкі чаргу ў мясцовай адміністрацыі з'яўляецца пражыванне ў жылых памяшканнях дзяржаўнага жыллёвага фонду па дагаворы паднайму ці ў жылых памяшканнях прыватнага жыллёвага фонду па дагаворы найму жылога памяшкання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Фелікс ЧАРНЯЎСКІ: «Паступленне крэдытаў — часовае вырашэнне праблемы. А аснова — развіццё экспарту і стрымліванне імпарту, развіццё малых вытворчасцяў»

**Цяперашнюю сітуацыю на валютным рынку краіны здольныя стабілізаваць крэдыты, магчымасць выдзялення якіх нашай рэспубліцы разглядаецца. Разам з тым, зазначыў кіраўнік навукова-метадалагічнага цэнтра Асацыяцыі беларускіх банкаў Фелікс ЧАРНЯЎСКІ, гэтыя пазыкі могуць выправіць становішча толькі на кароткі перыяд: рэспубліцы неабходна праводзіць структурныя рэформы.**

— Каб ліквідаваць дэфіцыт валютных рэсурсаў, з якім краіна цяпер сутыкнулася, трэба развіваць экспарт, рэалізоўваць эканамічныя праекты з тым, каб выйсці на станоўчае сальда гандлёвага балансу, — кажа Фелікс Чарняўскі.

**— Гэта значыць, тое, што мы спажываем больш, чым вырабляем, і стала прычынай праблем з валютай, з якімі сутыкнуліся прадпрыемствы і насельніцтва?**

— Так, мы жывём лепш, чым можам гэта сабе дазволіць. Як і ў любой гаспадарцы, трэба жыць па сродках: той, хто жыве за кошт грошай, якія пазычыў, павінен разумець, што па даўгах прыйдзецца плаціць. У нас кожны год нарастае адмоўнае сальда гандлёвага балансу. Аднак, калі мы хочам больш спажываць, неабходна лепш і больш вырабляць і прадаваць. Выправіць цяперашнюю сітуацыю, на мой погляд, дапаможа і правядзенне пэўнай дэвальвацыі, якая абмяжуе куплю валюты як насельніцтвам, так і прадпрыемствамі, а таксама павышэнне стаўкі рэфінансавання.

**— Узровень дэвальвацыі рубля з пачатку года пасля таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы ў чацвер склаў 7,13 працэнта. Аб'яўлены на сёлета калідор вагання курсу рубля да валютнага кошыка пакуль застаецца нязменным — плюс-мінус 8 працэнтаў. На ваш погляд, сітуацыя патрабуе большага абясцэньвання нацыянальнай валюты?**

— Я дакладнымі разлікамі не займаўся, але факт: трэба ліквідаваць множнасць курсаў і зноў выйсці на адзіны, каб не было ажыятажнага попыту на замежную валюту, каб народ супакоіўся, каб валюту можна было спакойна купіць, аднак ужо, вядома, давядзецца купляць па большай цане. Для нас важная стабільнасць, каб прадпрыемствы і насельніцтва працавалі ў больш стабільных умовах. Я ужо казаў, што паступленне крэдытаў — гэта часовае вырашэнне праблемы. А аснова — развіццё экспарту і стрымліванне імпарту, развіццё малых вытворчасцяў. Неабходна прыняць цэлы комплекс захадаў, якія б спрыялі развіццю экспарту. Тут няма ніякага вялікага сакрэту — ёсць звычайная эканамічная логіка, ёсць законы, якімі трэба кіравацца і ад якіх нікуды не дзенешся.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

Вяртаючыся да надрукаванага

## «ПЫТАННЕ АБ БЯСПЛАТНЫМ ЛЕКАВЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАЦЫЕНТАЎ У АДДЗЯЛЕННЯХ ДЗЁННАГА ЗНАХОДЖАННЯ НЕ РАЗГЛЯДАЕЦЦА»

**На старонках газеты па ініцыятыве і просьбе жыхара аграгарадка Гуды Лідскага раёна Іосіфа Браніслававіча ПІЛІНКО мы некалькі разоў звярталіся да такой тэмы, як магчымасць вяртання ранейшай практыкі па бясплатным забеспячэнні ўсім неабходным пацыентаў дзённага стацыянара. Упершыню гэты заклік да Міністэрства аховы здароўя, як свой зварот называў сам Іосіф Браніслававіч, быў надрукаваны ў «Звяздзе» 15 снежня мінулага года.**

Ужо 5 лютага бягучага мы змясцілі афіцыйнае рэагаванне з міністэрства, у якім прамога адказу на пытанне заяўніка — ці збіраюцца гэта зрабіць — так і не прагучала, хоць сам ліст быў змястоўным па аб'ёме. 16 сакавіка тэму падхапіў і падтрымаў ужо **пенсіянер з п/а Плюсы Браслаўскага раёна Мікалай Паўлавіч ДЗЯНІСАЎ.** У гэты дзень мы надрукавалі яго «Пісьмо з каментарыем» — «Нарматыў — гэта не Свяшчэннае Пісанне...» Сутнасць вынікае ўжо з загалоўка: чытач пісаў, што Міністэрства аховы здароўя зацыклілася на адным, маўляў, дапамога вядзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, а прамога адказу на простае пытанне, якое хвалюе многіх, не дае...

Днямі рэдакцыя атрымала чарговае рэагаванне з Міністэрства аховы здароўя. На гэты раз апошняя публікацыя ў «Звяздзе» разглядалася ўпраўленнем арганізацыі медыцынскай дапамогі сумесна з юрыдычным аддзелам — у межах кампетэнцыі, як пазначана ў адказе (на гэты раз значна больш лаканічным). Але перш, чым мы яго прывядзём цалкам — коратка пра яшчэ адзін ліст-водгук, які ў рэдакцыю даслаў **С.С. САЛАШ з вёскі Харошкі Дзятлаўскага раёна** пасля публікацыі ў газеце за 16 сакавіка.

«Вялікі дзякуй вам за публікацыі на балючую тэму — тэму аховы здароўя. Я чакаў гэтага часу, калі хто-небудзь першым, а не я, зачэпіць тэму здароўя». У сваім лісце чытач піша, што яго думкі па гэтай тэме сугучныя са словамі папярэдніх заяўнікаў — І.Б. Пілінко і М.П. Дзянісава, з якімі, нібы ў тым люстэрку, даслоўна супадае ўласнае меркаванне. Напрыканцы ён дадае: чакаем адказу ад Міністэрства аховы здароўя праз «Звязду». А цяпер уласна сам тэкст таго рэагавання з міністэрства.

**«Медыцынская дапамога ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь у амбулаторна-паліклінічных арганізацыях аховы здароўя аказваецца бясплатна.**

**У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, лекавыя сродкі для лячэння ў амбулаторна-паліклінічных арганізацыях пацыенты набываюць за кошт уласных сродкаў па рэцэптах урачоў амбулаторна-паліклінічных арганізацый аховы здароўя па месцы жыхарства (месцы знаходжання) або на льготнай ці бясплатнай аснове, у выпадку права на сацыяльныя льготы па лекавым забеспячэнні.**

**Пытанне аб бясплатным лекавым забеспячэнні пацыентаў у аддзяленнях дзённага знаходжання амбулаторна-паліклінічных арганізацый аховы здароўя не разглядаецца».**

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВЫПУСКНІК ВЫБІРАЕ...

**Самыя вялікія хваляванні для студэнтаў-выпускнікоў наступаюць падчас размеркавання, бо кожнаму хочацца трапіць на прэстыжнае прадпрыемства (арганізацыю), у добры калектыў і мець высокую зарплату. Учарашніх студэнтаў, як і іх бацькоў, чакае расчараванне.**



Сёлета Таццяна Рытус закончыла Баранавіцкі каледж лёгкай прамысловасці і атрымала спецыяльнасць бухгалтара. Дзяўчына вучылася на бюджэтным аддзяленні і ёй павінны былі прапанаваць работу, але Таццяна папрасіла свабодны дыплом і атрымала яго.

*— Мы ведалі, што існуюць пэўныя праблемы з уладкаваннем на працу, і пачалі шукаць для дачкі месца, — расказала маці выпускніцы Яніна Мечыславаўна. — На адным заводзе месца для Таццяны знайшлося і ёй неабходна было толькі атрымаць «свабодны дыплом». Але чамусьці дырэктар каледжа заўпарціўся і цягнуў час з выдачай дыплома. На заводзе месца трымалі, але калі мінуў тыдзень, пайшоў другі, а Таццяна ўсё яшчэ без дыплома, то чакаць не сталі. А цяпер у яе дыплом на руках, а працы няма.*

Давялося выйсці на дырэктара каледжа лёгкай прамысловасці Аляксандра Ліса.

— Аляксандр Аляксандравіч, як удалося ўладкаваць сёлета на працу вашых выпускнікоў? Мяне цікавяць бухгалтары.

*— Уладкавалі. З 26 чалавек толькі трое атрымалі свабодны дыплом, а яшчэ ў двух былі сацыяльныя прычыны. Такім чынам, 21 выпускнік атрымаў працу.*

— А што здарылася з Таццянай Рытус? Калі людзі самі знайшлі працоўнае месца, то, напэўна, трэба было пайсці насустрач і даць свабодны дыплом?

*— Сапраўды, Таццяна хацела мець «свабодны дыплом», але я хацеў, каб яна пайшла па размеркаванні. Званіў на завод, размаўляў са старшынёй прафкама, асабіста займаўся яе праблемамі.*

— А праблемы, на мой погляд, і не было. Неабходна было толькі адпусціць дзяўчыну з Богам.

*— Мне думалася, што для яе лепей будзе, калі на завод прыйдзе малады спецыяліст... існуюць ільготы.*

Што сёння рабіць са «свабодным дыпломам», калі на працу ўладкавацца няпроста, тым больш па спецыяльнасці? Людзі дамовіліся, вырашылі сваю праблему, то трэба было пайсці ім насустрач. Калі б не было магчымасці выдаць свабодны дыплом — заявак больш, чым выпускнікоў — то не было б размовы. А калі заводу не патрэбен малады спецыяліст, то навошта яго навязваць?

Старэйшая дачка Рытусаў Святлана 4 гады вучылася ў каледжы (былым ПТВ) на мадэльера і пасля заканчэння аказалася без працы, бо каму патрэбны сёння мадэльеры з «пэтэвушнай» адукацыяй? А каледж, тым не меней, мадэльераў выпускае дзясяткамі, і навучэнцам абяцаюць светлую творчую перспектыву. У палоне ілюзій знаходзяцца не толькі дзеці, але і іх бацькі. Яны вераць, што іх дачок чакае цікавая праца і высокія заробкі. Дзяржава таксама, у пройгрышы — нясе пустыя страты.

Святлане прыйшлося вучыцца далей, яна закончыла каледж лёгкай прамысловасці. Цяпер працуе тэхнолагам, задаволена працай і зарплатай. Праўда, за гэты час дзяўчына, пры яе здольнасцях, даўно магла закончыць універсітэт.

Сёння ў нашай адукацыі шмат што пераблыталася. І калі кіраўнік краіны заявіў, што неабходна нам вяртацца да савецкай сістэмы адукацыі, то тут ёсць здаровы сэнс.

У былым Саюзе сістэма адукацыі была даволі ясная. Сярэдняя школа, ПТВ, тэхнікум ды інстытут. А ў наш час усё ўскладнілася. Многія сярэднія школы набылі статус гімназій. Некаторыя прафесійна-тэхнічныя вучылішчы ператварыліся ў каледжы ды ліцэі, а працягваюць выпускаць тых жа муляраў, швачак, механізатараў...

Назвы змяніліся, а парог ведаў у абітурыентаў для паступлення ў ВНУ знізіўся да мінімуму, асабліва на платныя аддзяленні.

Неадназначная сітуацыя ў навучальных установах з размеркаваннем выпускнікоў. Здараецца, што нават кіраўнікі ВНУ наракаюць. Выпускнік, які закончыў універсітэт з чырвоным дыпломам, не можа сабе выбіраць месца працы. Прэстыжныя заяўкі часам дастаюцца выпускнікам, якія «абабівалі» сцэны ўніверсітэта, але ж атрымалі персанальныя запрашэнні.

Як у тым анекдоце.

Сын маёра пытаецца ў бацькі:

— Я магу стаць маёрам?

— Можаш, сынок.

— А генералам?

— Генералам не, бо ў генерала свой сын ёсць.

Сістэма адукацыі павінна быць зразумелай і празрыстай. Сумна, што іншым разам карпаратыўныя інтарэсы бяруць верх над грамадскімі.

Вяртаючыся да пачатку нашай размовы, трэба падкрэсліць, што кіраўнік павінен вырашаць праблему па сутнасці, а не ўскладняць яе.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

# «СУХАРАЎСКІ СПІС»

Працяг тэмы

## Ці спрыяюць некаторыя мінскія чыноўнікі з'яўленню беларускамоўнай групы ў дзіцячым садку?

**У «Звязду» прыйшоў ліст з Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама: усе пытанні будуць вырашаны. Некаторыя бацькі скардзяцца, што іх адгаворваюць аддаваць дзетак у беларускамоўную групу: «Мова не запатрабаваная, шафак на ўсіх можа не хапіць»...**

У сакавіку на старонках «Звязды» выйшаў артыкул пра тое, як 24 сям'і з Мінска спрабуюць уладкаваць сваіх дзяцей у беларускамоўную групу дзіцячага садка (нумар за 11 сакавіка г.г.).

У артыкуле распавядалася, што Фрунзенскі раён сталіцы, які па насельніцтве роўны некаторым абласным цэнтрам Беларусі, мае толькі адзін (!) беларускамоўны садок. А бацькі, якія хочуць, каб дзеці атрымлівалі адукацыю на роднай мове, вымушаны прайсці праз тузін бюракратычных перашкод. Быццам яны не беларусы, а нейкія бежанцы...

Пачалося з таго, што сёлета мінскі сталяр Уладзімір Сярко паспрабаваў уладкаваць свайго малодшага сына Усевалада ў беларускую групу дзіцячага садка. Але вось што пачуў у адказ: «Апроч вас ахвотных няма». Тады спадар Уладзімір расклеіў у сваім раёне аб'явы ў пошуку аднадумцаў. І за тыдзень-другі на мабільнік мужчыны патэлефанавалі з 24 маладых сем'яў, якія, аказваецца, таксама хочуць беларускай будучыні для сваіх карапузаў (сёння спіс ахвотных — больш за 30 такіх сем'яў). Гэтыя людзі сталі ўдзельнікамі так званага «сухараўскага спіса». Цікава, што многія бацькі аказаліся рускамоўнымі, якія, аднак, разумеюць, што будучыня краіны — за родным словам.

Бацькі расказалі і пра тое, што спробы арганізоўваць беларускамоўныя групкі былі і раней, паспяховыя і няўдалыя. Але найчасцей пазіцыя чыноўнікаў прыводзіла да таго, што патэнцыйныя беларускамоўныя групкі рассыпаліся.

І вось пасля выхаду крытычнага артыкула ў рэдакцыю прыйшоў ліст *«Аб разглядзе артыкула «У дзіцячым садку сын адвучваецца ад беларускай мовы»* з Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама. Дакумент падпісаны старшынёй Уладзімірам Шчэрбам (копія даслана і ў прэс-цэнтр Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта).

*«Камітэт па адукацыі, Упраўленне адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна падтрымліваюць пажаданне бацькоў аб адкрыцці груп з беларускай мовай навучання і выхавання ў адным альбо двух садках Фрунзенскага раёна. Бацькі атрымалі адказ аб тым, што згодна з іх пажаданнямі групы, будуць адкрыты, — напісана ў дакуменце. — У 2010—2011 навучальным годзе ў Мінску працуюць два беларускамоўныя садкі і 135 дашкольных груп з беларускай мовай навучання. Камітэт выказвае надзею, што*




*згодна з вынікамі сустрэчы, якая адбылася з ініцыятыўнай групай бацькоў, усе пытанні будуць вырашаны ў канструктыўным супрацоўніцтве на карысць дзяцей».*

У дакуменце было пазначана, што «запыты бацькоў вывучаюцца», а канчатковыя рашэнні будуць прымацца ў пачатку красавіка.

Тэрмін мінуў, і журналіст «Звязды» распытаў у бацькоў з «сухараўскага спіса», ці задаволены яны вынікам.

*— Мы ўжо было ўсцешыліся, што нам дадуць беларускамоўную групку. Хоць з 25 дзяцей семярых (2007 года нараджэння) накіравалі ў садок № 570, — падзялілася **Ганна СЯРКО, маці з «сухараўскага спіса».** — Па маёй інфармацыі, аддаваць дзяцей у гэты садок захацелі не ўсе сем'і... Астатнім прапанавалі іншую дашкольную ўстанову — № 565 па вуліцы Чайлытькі. Я і яшчэ адна матуля, Веранiка Лебедзь, усцешыліся і пабеглі пісаць заявы ў гэты садок. Хоць пазней мы зразумелі, што гэта была памылка, трэба было ісці ўсім разам. Бо некаторыя матулі, схадзіўшы ў гэты садок, вырашылі не рызыкаваць, не падаваць туды заяву. І засталіся ў звычайных рускамоўных дашкольных установах побач са сваім домам...*

Чаму так атрымалася? Журналіст «Звязды» датэлефанаваўся да некалькіх матуляў, якія вырашылі «не рызыкаваць» (прозвішчы людзей не будзем пазначаць на старонках газеты, каб ім не нашкодзіць).

Матулі расказалі, што ў садку № 565 іх актыўна адгаворвалі ад ідэй запісваць дзіця ў беларускамоўную групу: *«Сказалі, што група будзе перапоўненая, дзяцей будуць вазіць з усяго раёна ў аўтобусах, малыя будуць хварэць, шафак на ўсіх можа не хапіць...»*

Такім чынам, па інфармацыі ініцыятыўнай групы «сухараўскага спіса», толькі 10 сем'яў з 17-і напісалі заявы ў дашкольную ўстанову № 565. А іншым бацькам, якія хацелі б аддаць дзяцей сюды, у беларускамоўную групу, гэтага зрабіць не дазваляюць.

*— Бацькі скардзяцца, што як толькі яны заяўляюць пра жаданне трапіць у беларускамоўную групу садка № 565, да іх пачынаюць ставіцца прадузята, патрабуюць стос дакументаў. Таму ёсць падставы думаць, што жаданая беларускамоўная групка так і не арганізуецца, — падсумавалі бацькі з «сухараўскага спіса».*

Журналіст «Звязды» пад выглядам маладога бацькі патэлефанаваў у садок № 565: *«Хачу аддаць да вас сваё беларускамоўнае дзіця».* Адгаворваць мяне не сталі і адправілі ў раённае ўпраўленне адукацыі паразмаўляць на гэту тэму. Але не даўяраць словам бацькоў падстаў таксама няма.

Нагадаем, што беларуская мова ўнесена «ЮНЕСКА» ў спіс моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. І ў такой сітуацыі любыя беларускамоўныя ініцыятывы павінны вітацца і заахвочвацца.

«Звязда» будзе сачыць за лёсам дзяцей з «сухараўскага спіса».

**Яўген ВАЛОШЫН.**

### АД АЎТАРА

На першы погляд, сітуацыя, апісаная ў гэтым артыкуле, дробязная. Ну што такое адна беларускамоўная групка ў межах цэлай дзяржавы?

Аднак гэта сітуацыя ілюструе дзве істотныя праблемы.

Першая: калі ў райвыканкаме арганізоўваецца чарга ў дзіцячыя садкі, моўную прыналежнасць дзяцей фіксаваць не прынята. І чыноўнікі не маюць аб'ектыўнай карцінкі, колькі беларускамоўных садкоў павінна быць. Да таго ж, калі дзіця з цяжкасцю трапіла ў перапоўнены садок, бацькі часта баяцца нават заікнуцца пра беларускую мову.

Другая праблема — тое, што ў Беларусі бацькі павінны ў літаральным сэнсе біцца за правы сваіх дзяцей атрымліваць адукацыю на роднай мове. Пра «сухараўскі спіс» напісала газета «Звязда», найбуйнейшы інтэрнэт-партал краіны TUT.BY, яшчэ некалькі газет, перадало адно з інфармацыйных агенцтваў. А ці будзе арганізавана групка, дагэтуль незразумела.

А чаму так атрымліваецца?

Таму што для некаторых чыноўнікаў, якія павінны сёння займацца рэанімаваннем беларускай мовы, бацькі з «сухараўскага спіса» і журналісты, як я, — хто заўгодна (назойлівыя мухі і г.д.), але не патрыёты і не эліта.

І ў выніку нашы стандартныя прадстаўнікі маладога пакалення, якія выхоўваюцца як давядзецца, і растуць нярэдка адпаведна...

І карані праблемы пачынаюць віцца ад самых дзіцячых садкоў...

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«МИНПЛАСТ»
адрес: 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 15,тел. 267 91 18
БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г. млн руб.

| Наименование показателя | На начало отчетного периода | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| АКТИВ | | |
| 1. Внеоборотные активы | 152 | 195 |
| 2. Оборотные активы | 255 | 273 |
| БАЛАНС | 407 | 468 |
| ПАССИВ | | |
| 3. Капитал и резервы | 305 | 356 |
| 4. Обязательства | 102 | 112 |
| БАЛАНС | 407 | 468 |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателей | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | 1019 | 968 |
| Себестоимость реализованных товаров, работ, услуг | 921 | 900 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 98 | 68 |
| Прибыль от операционных доходов | 1 | 1 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | -38 | -27 |
| Итого прибыль (убыток) за отчетный период | 61 | 42 |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 27 | 23 |
| Прибыль (убыток) к распределению | 34 | 19 |
| Количество акционеров: | 18 | - |
| юридических лиц | 1 | - |
| физических лиц | 17 | - |

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| | | |
|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов за 2010 год | 3.6 | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | 5.55 т.р. | - |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | - | - |

*Баланс подтвержден ревизионной комиссией ОАО «Минпласт»*

Руководитель Легчилов Владимир Кузьмич
Главный бухгалтер Мазина Татьяна Ивановна

Предложение о покупке акций ОАО «Стройтрест № 7»

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение покупателя акций | Открытое акционерное общество «Стройтрест № 7» 220005, Минск, пр. Машерова, д. 16, тел. 284 46 39 |
| Полное наименование и местонахождение профессионального участника рынка ценных бумаг, регистрирующего сделки купли-продажи акций | Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» г. Минск, пр. Машерова, 29 |
| Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого покупаются | Открытое акционерное общество «Стройтрест № 7» 220005, Минск, пр. Машерова, д. 16 |
| Количество акций, которое намеривается приобрести Покупатель | 10 000 (десять тысяч) акций |
| Цель приобретения акций | сокращение их общего количества с последующим аннулированием |
| Цена приобретения акций | 50 000 (пятьдесят тысяч) белорусских рублей |
| Сроки, форма и порядок оплаты акций | В течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи акций путем перечисления денежных средств на счет продавца в отделении № 527 ОАО «Белинвестбанк», код 739, г. Минск, пр. Машерова, 16 |
| Место заключения договоров купли-продажи акций | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29 |
| Дата начала представления предложений акционеров на продажу акций | 01 апреля 2011 года |
| Дата окончания представления предложений акционеров на продажу акций | 31 мая 2011 года |
| Дата начала покупки акций | 01 июня 2011 года |
| Дата окончания покупки акций | 30 сентября 2011 года |

УНП 100512859

Информация о проведении аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

| | |
|---|---|
